Яноўская, В.В. Указ 17 красавіка 1905 г. “Аб замацаванні пачаткаў верацярпімасці” ў сучаснай гістарычнай традыцыі / В. В. Яноўская // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 2 / рэдкал. У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.] – Мн: БДУ, 2007. – С. 85–91

***В. В. ЯНОЎСКАЯ***

# УКАЗ 17 КРАСАВІКА 1905 г. «АБ ЗАМАЦАВАННІ ПАЧАТКАЎ ВЕРАЦЯРПІМАСЦІ» Ў СУЧАСНАЙ ГІСТАРЫЧНАЙ ТРАДЫЦЫІ

17 (29) красавіка 1905 г. у Расійскай імперыі быў прыняты «Именной Высочайший Указ Правительствующему Сенату», вядомы пад назвай «Об укреплении начал веротерпимости». Сцвярджаць, што аналіз гэтай падзеі займае адпаведнае месца ў сучаснай гістарычнай традыцыі, было б перабольшваннем. Бо да гэтага часу не маецца спецыяльнай работы, дзе б дэталёва разглядаліся ўсе бакі гэтай з’явы: падрыхтоўка ўказа, аналіз самога дакумента і тых дакументаў, што папярэднічалі ці ішлі ўслед за ім. А галоўнае, няма дэталёвага разгляду тых падзей, што адбыліся пад яго ўздзеяннем. Прычыны тут розныя: бурныя падзеі пачатку XX ст. не спрыялі навуковым даследаванням, захаванасці архіўных спраў. Пазней, у савецкі перыяд, вывучэнне канфесіянальнай гісторыі наогул не ўхвалялася. Гэта было абумоўлена перш за ўсё тым, што афіцыйная грамадская думка ігнаравала наогул такую тэму, як гісторыя Царквы. Відаць, таму і атрымалася так, што да гэтага часу ў большасці сваёй гучаць ацэнкі, што былі дадзены падчас саміх падзей праваслаўнымі дзеячамі. Што гэта за ацэнкі?

Абвяшчэнне ўказа ад 17 красавіка 1905 г. без адначасовага рэфармавання праваслаўнай царквы выклікала вялікае незадавальненне з боку праваслаўнага духавенства ўсіх рангаў. Яны непакоіліся галоўным чынам па адной прычыне. Паколькі ніякіх рэформ у праваслаўнай царкве не адбылося і яна не гатова да змены канфесіянальнага курсу палітыкі ўрада, то ўсе іншыя канфесіі апынуцца ў лепшым становішчы, чым праваслаўная. Разам з тым і праваслаўныя святары, ва ўсялякім выпадку некаторыя з іх, лічылі прыняцце ўказа неабходным, станоўчым крокам урада. Гэтыя думкі, спрэчкі выліваліся на старонкі афіцыйнага друку. «Епархиальные ведомости» час ад часу рабілі агляды гэтых публікацый. Напрыклад, у «Минских епархиальных ведомостях» за 1906 г. зроблены такі агляд пад назвай «Зло от манифеста 17 апреля». У ім адзначалася, што праваслаўны святар Амвросій Жалязнякоў на старонках друку выказаў дваякую думку пра маніфест. Па-першае, ён заўважыў, што прыняцце ўказа — гэта гуманны акт, які дазволіў кожнаму чалавеку прыняць веру сваіх бацькоў (а больш праўдзіва, удакладняюць яго іншыя аўтары, — выбраць веру «як падказвае сэрца», а не толькі як склалася традыцыйна — веру бацькоў). Другі бок гэтага акта — ён прынёс вялікую шкоду, бо дазволіў пераходы з праваслаўя ў каталіцтва і паставіў пра-



васлаўную царкву ў адно становішча з сектанцтвам. З такой думкай не пагаджаецца свяшчэннік С. Ваяводскі. «Не, — заўважае ён, — праваслаўная царква стаяла і будзе стаяць на сваёй былой вышыні, заўсёды была і будзе пануючай у свеце, але не па знешніх прывілеях, а па духу, па вышыні сваёй дагматыкі і чысціні сваёй маралі»[1].

Думка пра тое, што праваслаўная царква была пакрыўджана ў параўнанні з усімі іншымі канфесіямі Расійскай імперыі, настолькі трывала ўкаранілася, што мы яе можам сустрэць і ў сучаснай гістарыяграфіі, як царкоўнай, так і свецкай. «Указ ад 17 красавіка 1905 г. і маніфест ад 17 кастрычніка 1905 г. змякчылі або наогул адмянілі ранейшыя законы аб абароне праваслаўя» — такая ацэнка дадзена ў кнізе «История Русской Церкви», што адпавядае афіцыйнаму пункту гледжання Рускай Праваслаўнай Царквы[2]. «Указ аб верацярпімасці, — піша канадскі (рускі?) гісторык Д. Паспялоўскі, — даваў свабоду ўсім рэлігіям імперыі, акрамя праваслаўя, якое адно сярод усіх рэлігій застанецца ў палоне дзяржапарату. А калі ўлічыць, што галоўным заканадаўчым органам становіцца Дума, то становішча Праваслаўнай Царквы яшчэ больш пагоршыцца, бо ёю будзе кіраваць не толькі праваслаўны цар, але яшчэ і амаль бязбожная Дума»[3].

Цікава, чаму гэтыя палажэнні аўтар пераносіць толькі на праваслаўную царкву? Структура падпарадкавання ўсіх іншых (неправаслаўных) канфесій Расійскай імперыі засталася нязменнай пасля 17 красавіка 1905 г. Як і раней, імі кіраваў Дэпартамент духоўных спраў замежных веравызнанняў, а веравызнаўчыя законы для іх прымала тая ж самая «амаль бязбожная Дума». Больш таго, ніводны веравызнаўчы закон не прымаўся без папярэдняга ўзгаднення са Св. Сінодам.

Аўтары кнігі «Русское православие: вехи истории» разглядаюць дзейнасць указа і яго наступствы толькі з аднаго боку: дазволу пераходаў з праваслаўнага ў іншыя хрысціянскія веравызнанні. «Усіх ягоных наступстваў, — адзначаецца ў кнізе, — урад, відаць, не прадбачыў. У заходніх губернях былыя уніяты,

падчас Пратасава «воссоединенные» з праваслаўем, сталі тысячамі пераходзіць у каталіцтва. Усяго за 1905—1907 гг. з праваслаўя ў каталіцтва перайшло звыш 170 тыс. чалавек»[4].

Трэба пагадзіцца з аўтарамі кнігі, што дазвол праваслаўным пераходзіць у іншыя хрысціянскія веравызнанні і на самай справе быў вялікай радыкальнай адметнасцю гэтага ўказа. Але разам з тым не будзем перабольшваць яго наступствы. Падставы для падобнага сцвярджэння бачацца нам у наступным. Указ аб верацярпімасці, хоць і стаў асноватворным у канфесіянальнай палітыцы ўрада Расійскай імперыі, аднак, не азначаў поўнага адказу ад мінулага. Дазволіўшы свабодны пераход з аднаго веравызнання ў іншае (і галоўнае — з праваслаўя), указ толькі ўскосна аслабляў дзейнасць старых

86

юрыдычных норм. Ён не пахіснуў пазіцый праваслаўнай царквы. Як і да гэтага часу, дзяржаўныя законы лічылі яе «первенствующей и господствующей». Праваслаўная царква, як пануючая, карысталася правам публічнай прапаведзі, з якога выцякала «неприкосновенность для прозелитизма». Заканадаўча гэта было зацверджана ў статуце духоўных спраў іншаземных веравызнанняў. У ім адзначалася: «У межах дзяржавы адна пануючая праваслаўная царква мае права пераконваць вернікаў іншых хрысціянскіх веравызнанняў і іншаверцаў да прыняцця яе вучэння аб веры»[5]. Гэтае права захавалася і пасля 1905 г.

У адносінах тысяч, нават соцень тысяч перайшоўшых у каталіцтва. Няўзгодненасць дзеянняў паміж урадам і кіраўніцтвам рымска-каталіцкай царквы (у адносінах пераходаў праваслаўных вернікаў у каталіцтва) спараджала шмат непаразуменняў. Лічбы перайшоўшых выклікалі шмат спрэчак, яны і сёння сустракаюцца розныя, з даволі значнымі разыходжаннямі. Складальнікі даведніка «История Римско-Католической Церкви в Российской Империи (XVIII—XX вв.) в документах Российского государственного исторического архива» адзначаюць (таксама «па афіцыйных даных»), што за 1905—1909 гг. да каталіцкай царквы далучылася 233 тыс. чалавек[6]. Значную частку вышэйназваных пераходаў складалі пераходы ў беларуска-літоўскіх губернях. Паводле звестак кіраўніка Віленскай рымска-каталіцкай епархіі, лічба тых, хто за 1905—1909 гг. перайшоў з праваслаўя ў каталіцтва, склала па епархіі 62 тыс. чалавек[7]. Польскія гісторыкі на пачатку XX ст. згадвалі такія лічбы: за 1905 — 1909 гг. у «Паўночна-Заходнім краі» перайшло ў каталіцтва 56 тыс. праваслаўных[8]. Усе гэтыя лічбы не стасуюцца з данымі Дэпартамента духоўных спраў замежных веравызнанняў. Вось гэтыя звесткі. Пачынаючы з 17 красавіка 1905 г. і па красавік 1909 г. з праваслаўя ў каталіцтва перайшлі ў губернях[9]:

Віцебскай — 8 197 чал., у т. л. 200 сямей;
Магілёўскай — 1 347 чал., няма звестак;
Мінскай — 14 846 чал., у т. л. 1724 сям'і;
Кіеўскай — 1 720 чал., у т. л. 174 сям'і;
Падольскай — 612 чал., у т. л. 40 сямей;
Валынскай — 1 314 чал., няма звестак;
Віленскай — 18 568 чал., няма звестак;
Ковенскай — 1 123 чал., у т. л. 131 сям'я;
Гродзенскай — 4 116 чал., у т. л. 6 сямей;
Люблінскай — 41 288 чал., у т. л. 7 200 сямей;
Сядлецкай — 106 507 чал., у т. л. 18 565 сямей;
Сувалкскай — 15 930 чал., у т. л. 2 822 сям'і.
Усяго — 211 566 чал., у т. л. 30 862 сям'і.

87

Разыходжанні тлумачацца тым, што ўказ 17 красавіка не ўтрымліваў правілаў пераходаў, што выклікала ўжо праз некалькі дзён з'яўленне распараджэння ў межах рымска-каталіцкай канфесіі. Толькі 18 жніўня 1905 г. былі выдадзены часовыя правілы МУС аб пераходзе з праваслаўнага веравызнання ў іншае хрысціянскае і вяртанні з праваслаўя ў нехрысціянскую веру. Аднак каталіцкія святары аж да 1908 г. прымалі вернікаў, кіруючыся распараджэннямі сваіх епіскапаў. У выніку атрымалася так, што адных і тых жа вернікаў і праваслаўная царква, і каталіцкая лічылі сваімі. Спроба рэгуляваць дадзенае пытанне была зроблена толькі ў 1915 г., прытым даволі няўдала. 17 ліпеня 1915 г. міністр унутраных спраў кн. Шчарбатаў падпісаў распараджэнне аб прызнанні католікамі (з дня іх фактычнага далучэння) тых праваслаўных, якія перайшлі ў каталіцтва ў тэрмін з 17 красавіка па 1 лістапада 1905 г.[10] Але дадзенае распараджэнне не вырашыла праблему, бо значная частка змяніўшых веру не змагла яго скарыстаць.

Не менш складанымі і неадназначнымі былі і іншыя моманты, пазначаныя ва ўказе. Вядомы беларускі даследчык А. Грыцкевіч адзначае, што дадзены акт — гэта «ўступка расійскага царызму, зробленая на карысць каталіцкага Касцёла... Паводле ўказа 1905 года праваслаўныя маглі пераходзіць у каталіцтва "без асабістых і цывільных наступстваў", католікам вярталіся зачыненыя касцёлы (за выключэннем

перададзеных праваслаўнай Царкве), вывучэнне рэлігіі ў школах дазвалялася весці на роднай мове вучняў, уніятам абвяшчалася амністыя, якую яны скарысталі, прымаючы лацінскі абрад»[11]. Так гэтым указам і на самай справе была дадзена палёгка каталіцкаму касцёлу. Але мае рацыю польскі даследчык Мар’ян Ракоўскі, што «1905 і 1917 гг. прынеслі радыкальныя перамены», але «абсалютна спрэчныя і неадназначныя»[12].

Адносна перадачы будынкаў, што раней належалі католікам, Анатоль Грыцкевіч дадае вельмі слушную агаворку, што католікам вярталіся іх храмы, акрамя тых, што былі перададзены праваслаўнай царкве. Менавіта ў гэтым і заключаецца сутнасць праблемы. Згодна з архіўнымі данымі, большая частка каталіцкіх касцёлаў і манастыроў пры іх закрыцці перадавалася ў праваслаўнае ведамства. Зусім не так адназначна вырашалася і пытанне адносна выкладання Закона Божага на роднай мове вернікаў. Не маючы магчымасці спыняцца падрабязна на гэтым пытанні, адзначым толькі, што каталіцкае духавенства ў большасці сваёй выкарыстала гэтае права, каб выкладаць Закон Божы для вернікаў-беларусаў на польскай мове. Што ж тычыцца амністыі уніятам і скарыстання яе пры пераходзе ў лацінства, то дастаткова параўнаць лічбы перайшоўшых у рыма-каталіцтва і тых, што былі далучаны да праваслаўнай царквы падчас скасавання уніі (1839 г.). Але, нягледзячы на тое, што рэзультатыўнасць дадзенай з’явы была не такой ужо і



вялікай (якую б лічбу мы не ўзялі за аснову, яна будзе вагацца ў межах 1—1,5 % ад колькасці праваслаўных жыхароў, што жылі ў пяці беларуска-літоўскіх губернях), ёй надавалася вялікая ўвага. Друкаваліся артыкулы, што прыводзілі самыя розныя, фантастычныя лічбы тых, хто быццам бы перайшоў у каталіцтва. Адгалоскі тых падзей чуваць і сёння.

Не менш складанай заставалася праблема міжканфесіянальных (змешаных) шлюбаў, якія былі дазволены Св. Сінодам яшчэ ў 1721 г. Але закон прадугледжваў, каб святое таінства шлюбу праваслаўных з хрысціянамі іншых канфесій адбывалася ў праваслаўных храмах і праваслаўнымі святарамі. Указ ад 17 красавіка (як і Маніфест ад 17 кастрычніка) 1905 г. захаваў перавагу праваслаўнай царквы і рэгулюючую ролю дзяржавы. Як слушна заўважае расійскі даследчык Л. Гарызонтаў, «ён не ўводзіў новых правілаў для рэгулявання парадку заключэння рознаверных шлюбаў і вызначэння канфесіянальнай належнасці народжаных у іх дзяцей. На стадыі падрыхтоўкі закону важнай зноў аказалася пазіцыя дзяржаўнай царквы, прадстаўнікі якой сцвярджалі, што тое заканадаўства, якое існавала, успрымаецца насельніцтвам належным чынам, і пужалі міністраў небяспечнымі наступствамі ў выпадку яго адмены»[13]. Згодна з гэтымі законамі, змешаныя шлюбы (калі адзін з уступаючых у шлюб быў праваслаўным) павінны былі адбывацца па праваслаўным абрадзе, а дзеці, што нарадзіліся ад такога шлюбу, хрысціцца і выхоўвацца па правілах праваслаўнай царквы. У выпадку, калі хтосьці з бацькоў, што быў праваслаўным, пераходзіў у каталіцтва, то і дзеці да 14 гадоў маглі быць пераведзены ў каталіцтва. З дадзенага агульнарасійскага правіла рабілася выключэнне. У Віленскай, Віцебскай, Валынскай, Гродзенскай, Кіеўскай, Ковенскай, Мінскай, Магілёўскай і Падольскай губернях заключэнне шлюбу паміж асобамі розных хрысціянскіх канфесій адбывалася па абрадзе і святаром той веры, да якой належала нявеста. Калі святар адмаўляўся, то гэту місію мог выканаць святар іншага веравызнання (жаніха). Дзеці, што нарадзіліся ад такога шлюбу, выхоўваліся: сыны — у веры бацькі, дочкі — у веры маці [14].

Беларускі гісторык А. Жлутка звяртае ўвагу на такія цікавыя моманты ў дзейнасці каталіцкага касцёла на пачатку XX ст. Ён піша: «Пасля рэвалюцыі 1905 г. ва ўмовах адноснай лібералізацыі адбылося пэўнае ажыўленне дзейнасці каталіцкага касцёла на Беларусі, былі адроджаныя асобныя парафіі. Узнік і стаў імкліва нарастаць беларускі нацыянальна-культурны рух, якому спачувала і спрыяла частка каталіцкага духавенства»[15]. І гэта сапраўды так. Але калі прааналізаваць падзеі больш уважліва, то добра відаць, што не адбылося асаблівых змен у пытанні пабудовы каталіцкіх храмаў. Па-ранейшаму толькі праваслаўная канфесія мела ў гэтай справе шырокія магчымасці і



падтрымку дзяржавы. Праўда, рост колькасці праваслаўных цэркваў ужо не адбываўся такімі хуткімі тэмпамі, як гэта назіралася пасля паўстання 1863 г. На пачатку XX ст. гэтыя тэмпы былі больш маруднымі. Пра гэта сведчыць прыклад Віленскай губерні. За 1905—1913 гг. у губерні было пабудавана 27 праваслаўных і 28 каталіцкіх храмаў. На першы погляд можа падацца, што гэта відавочныя змены канфесіянальнай палітыкі ў накірунку верацярпімасці, стварэння роўных умоў для жыццядзейнасці ўсіх канфесій. Але ў дадзенай губерні колькасць католікаў больш чым у два разы пераўзыходзіла колькасць праваслаўных вернікаў, а колькасць каталіцкіх храмаў у 1,5 раза была меншай, чым праваслаўных цэркваў.

У заключэнне хацелася б звярнуцца яшчэ да адной ацэнкі дадзенага дакумента. У кнізе «История Римско-Католической Церкви в Российской Империи (XVIII—XX вв.) в документах Российского государственного исторического архива» адзначаецца: «17 красавіка 1905 года імператар Мікалай II выдаў

Маніфест аб свабодзе веры ў Расійскай Імперыі, які прынёс доўгачаканае ўраўнаванне правоў розных веравызнанняў. Больш не павінна было быць судовых праследаванняў з-за пераходу праваслаўных у іншыя веры. Маніфест садзейнічаў, да некаторай ступені, нармалізацыі становішча Каталіцкай Царквы, хоць некаторыя праблемы ўсё же засталіся»[16]. Нам падаецца не зусім карэктным весці размову аб «свабодзе» веры, калі не быў прадугледжаны пазаверавызнаўчы стан. Па-другое, «доўгачаканае ўраўнаванне правоў розных веравызнанняў» так і не адбылося. Што відаць з далёка не поўнага аналізу ўказа. А вось калі гаварыць пра тое, што «Маніфест садзейнічаў, да некаторай ступені, нармалізацыі становішча Каталіцкай Царквы», то тут і трэба перш за ўсё высветліць гэтую ступень нармалізацыі.

Мы ж лічым, што аналіз архіўных матэрыялаў дае нам падставы сцвярджаць, што ўказ аб верацярпімасці не прынёс жаданага спакою рэлігійнаму жыццю беларуска-літоўскіх губерняў. Пераходы насельніцтва з праваслаўя ў іншыя канфесіі, галоўным чынам у каталіцкую, абвастрыў узаемаадносіны паміж праваслаўным і каталіцкім духавенствам. А тыя, у сваю чаргу, сеялі гэтую нецярпімасць сярод вернікаў. Не былі ажыццёўлены і роўныя правы, на якія разлічвалі ўсе канфесіі. Прывілеі па-ранейшаму заставаліся ў праваслаўнай царквы. Што да правоў іншых, то праз невялікі адрэзак часу пачаліся адступленні нават ад таго, што даваў указ.

---

1 Минские епархиальные ведомости за 1905 год. Мн., 1906. С. 478, 479.

2 История Русской Церкви: В 9 т. М.: Изд-во Спасо-Преображенского Валаамского монастыря, 1994—1997. Т. 8: 1700—1917. 1997. Ч. 2. С. 311.



3 *Поспеловский Д. В.* Русская православная церковь в XX веке. М.: Республика, 1995. С. 29, 30.

4 Русское православие: вехи истории. М.: Политиздат, 1989. С. 396, 397.

5 Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (далей — РДГА). Ф. 821. Воп. 10. Спр. 28. Арк. 159.

6 История Римско-Католической Церкви в Российской Империи (XVIII—XX вв.) в документах Российского государственного исторического архива. Санкт-Петербург — Варшава: Наука РАН, 1999. С. 128.

7 Нацыянальны гістарычны архіў Літвы. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 2954. Арк. 110 адв.

8 *Wasilewski L.* Litwa i Białoruś. Kraków, 1912. С. 86—87.

9 РДГА. Ф. 821. Воп. 10. Спр. 279. Арк. 62 адв., 63.

10 Мяжа 17 красавіка — зразумелая. Гэта дата прыняцця закона аб верацярпімасці. Што да 1 лістапада, відаць, на думку міністра, да гэтага часу, з улікам тэрмінаў тагачаснай службы зносін, мясцовым уладам і рымска-каталіцкім епіскапам ужо быў вядомы цыркуляр ад 18 жніўня 1905 г., які ўтрымліваў часовыя правілы пераходаў з аднаго веравызнання ў другое.

11 *Грыцкевіч А.* Удзел у адраджэнні // Наша вера. 1998. № 2. С. 87.

12 *Ракоўскі М.* Супрацьстаянне // Наша вера. 1996. № 1. С. 87.

13 *Горизонтов Л. Е.* Парадоксы имперской политики: поляки в России и русские в Польше. М.: Индрик, 1999. С. 93.

14 РДГА. Ф. 821. Воп. 10. Спр. 57. Арк. 51.

15 *Жлутка А.* Спроба кароткага падсумавання гісторыі каталіцкага Касцёла на Беларусі // Наша вера. 2000. № 2. С. 68.

16 История Римско-Католической Церкви в Российской Империи (XVIII—XX вв.) в документах Российского государственного исторического архива. С. 128.